# Фізіка для мацнейшых

**У сталіцы праходзіць Адкрытая беларуская фізічная алімпіяда школьнікаў. Яе адкрыццё адбылося ў анлайн-фармаце ў ліцэі БДУ.**

У спаборніцтвах прымаюць удзел каманды з 9 краін свету: Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі, Сірыі, Таджыкістана, Турцыі, Узбекістана і Рэспублікі Беларусь. Алімпіяда праводзіцца для навучэнцаў дзвюх узроставых груп (малодшая — ад 13 да 15 гадоў, старэйшая — ад 16 да 18 гадоў). Афіцыйныя мовы алімпіяды — руская і англійская.



У беларускай камандзе — школьнікі, якія дасягнулі высокіх вынікаў на абласным і рэспубліканскім узроўнях. Кіраўнікамі нашай каманды з'яўляюцца Арцём Півапарчык і Уладзіслаў Клімашонак.

Звяртаючыся з прывітальным словам да юных знаўцаў фізікі, старшыня арганізацыйнага камітэта алімпіяды міністр адукацыі Андрэй Іванец адзначыў, што ўдзел у гэтым мерапрыемстве будзе іх першым крокам у навуку. Ён пажадаў удзельнікам алімпіяды праявіць свае веды і навыкі, але пры гэтым тым, хто не пераможа, не засмучацца, бо гэта адзін з этапаў у жыцці.

— У Беларусі мы па праве ганарымся вучонымі-фізікамі, якія вельмі актыўна развіваюць закладзеныя яшчэ ў савецкі час навуковыя школы ў галіне лазерных тэхналогій, мікраэлектронікі, оптыкі і іншых напрамкаў, — падкрэсліў міністр адукацыі. — Сёння ў рэспубліцы створаны ўсе неабходныя ўмовы для развіцця дзіцячай тэхнічнай творчасці і падтрымкі адоранай моладзі. Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк, які расчыніў свае дзверы 1 студзеня 2021 года, сёння вядзе падрыхтоўку па 15 напрамках навуковых даследаванняў.

Намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі навуковы кіраўнік цэнтра "Квантавая оптыка і квантавая інфарматыка" Інстытута фізікі НАН Сяргей Кілін прызваў юных фізікаў выкарыстоўваць па максімуме свае магчымасці.

— Хацелася б, каб школьнікі з тых краін, якія ўдзельнічаюць у алімпіядзе, адчулі, што беларуская фізічная школа — гістарычная, бо тут працавалі шматлікія выбітныя навукоўцы, — сказаў Сяргей Кілін. — Беларусь займаецца падрыхтоўкай у галіне фізікі, выкарыстоўваючы алімпіядны рух, даўно. Сучасны этап фізікі няпросты. Усё больш і больш штучны інтэлект пачынае выцясняць інтэлект чалавека, і тут тым, хто ступае на сцежку фізікі, трэба задумацца, дзе, у якіх месцах і як чалавек можа максімальна выкарыстоўваць свае магчымасці ў пазнанні новага.

Рэктар БДУ Андрэй Кароль адзначыў, што БДУ ганарыцца сваімі студэнтамі. Сярод іх ёсць прызёры міжнародных, рэспубліканскіх алімпіяд, у тым ліку па фізіцы. Напрыклад, толькі за апошніх пяць гадоў ва ўніверсітэт паступіла больш за 20 пераможцаў Рэспубліканскай алімпіяды па фізіцы.

— Удзел у алімпіядах — не толькі вялікі гонар, але і адказнасць перад самім сабой, школай, рэгіёнам. Не дазваляйце эмоцыям узяць верх над розумам. Заўсёды верце ў сябе і заўсёды трымайце вобраз свайго настаўніка ў галаве. І памятайце: у гэтых спаборніцтвах прайграўшых няма, — заклікаў Андрэй Кароль школьнікаў.

Звяртаючыся да ўдзельнікаў спаборніцтваў, рэктар выказаў спадзяванне, што ў далейшым юныя фізікі для свайго прафесійнага станаўлення выберуць БДУ.

— Беларускія фізічныя алімпіяды заваявалі вялікую папулярнасць ва ўсім свеце. Аб гэтым сведчыць тое, што многія краіны звяртаюцца да нас па тэксты, рашэнні нашых задач. Таму даўно варта было арганізаваць адкрытую беларускую алімпіяду з запрашэннем замежных удзельнікаў. У гэтым годзе нам удалося гэта зрабіць (алімпіяда ініцыравана Міністэрствам адукацыі сумесна з БДУ. — *Заўвага аўтара.*), — зазначыў старшыня журы алімпіяды загадчык кафедры агульнай фізікі БДУ Анатоль Слабадзянюк.

У склад журы алімпіяды ўвайшлі вучоныя з Беларусі, Арменіі і Казахстана. Каманда, якая распрацоўвала заданні для тэарэтычнага і эксперыментальнага тураў, старалася зрабіць іх цікавымі і змястоўнымі.

— Мы б хацелі, каб вы адчулі стыль задач, якія прапануюцца на нашых беларускіх алімпіядах. Спадзяюся, што тэксты, умовы задач вам спадабаюцца, — адзначыў старшыня журы, звяртаючыся да ўдзельнікаў. — Фізіка — навука эксперыментальная, таму ні адна фізічная алімпіяда не можа абысціся без эксперыментальнага тура. На жаль, пакуль немагчыма пераслаць па электроннай пошце фізічнае абсталяванне, таму, як гэта звычайна робіцца на дыстанцыйных алімпіядах, другі тур будзе псеўдаэксперыментальным.

Арганізатары фізічнай алімпіяды ўпэўнены, што мерапрыемства будзе садзейнічаць умацаванню сяброўскіх сувязей навучэнскай моладзі для будучага супрацоўніцтва ў навуковай супольнасці.

Для ўдзельнікаў алімпіяды падрыхтавана віртуальная культурная праграма, якая дапаможа ім бліжэй пазнаёміцца з культурай і гісторыяй нашай краіны.

**Падрыхтавала Наталля КАЛЯДЗІЧ.**